Беларусь

# ЯК УСПРЫМАЮЦЬ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ПЕРАЖЫЛІ КАТАВАННІ І/АБО ЖОРСТКАЕ АБЫХОДЖАННЕ





МІЖНАРОДНЫ
КАМІТЭТ
ПА РАССЛЕДАВАННІ
КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

*(як спецпраект «Прававой ініцыятывы», што дзейнічае ў рамках праекту International Accountability Platform for Belarus)*

Беларусь

# ЯК УСПРЫМАЮЦЬ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ПЕРАЖЫЛІ КАТАВАННІ І/АБО ЖОРСТКАЕ АБЫХОДЖАННЕ

*Аналітычнае даследаванне*

Кіраўнік даследчай групы Генадзь Коршунаў



# Змест


Уводзіны 5

Правасуддзе для людзей, якія перажылі катаванні: Псіхалагічныя аспекты 7

Правасуддзе для людзей, якія перажылі катаванні: Юрыдычныя аспекты 11

- Нацыянальныя сродкі прававой абароны 11
- Тэрміны даўніны 12
- Міжнародныя сродкі прававой абароны 13

Метадалогія даследавання 17

Методыка 19

Вынікі даследавання 22

Пасляслоўе 39

Дадатак 40



# Уводзіны

*Жорсткае задушэнне пратэстаў у Беларусі, што разгарнуліся пасля фальсіфікацыі вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года, шакавала не толькі беларусаў, але і ўвесь свет. Пагарда да закона, прававое самавольства, нічым не абмежаваны гвалт і далейшыя палітычныя рэпрэсіі сталі надзвычайнымі падзеямі ў найноўшай гісторыі Усходняй Еўропы.*

Вынікі сацыялагічных даследаванняў сведчаць: тым або іншым досведам асабістай датычнасці да гвалту супраць пратэстоўцаў былі ахопленыя амаль 100% прадэмакратычнай альбо прапратэсна настроенай часткі грамадства[1]. Прычына гэтага — самавольства і гвалт з боку сілавых структур на вуліцах беларускіх гарадоў і ў месцах абмежавання волі[2]. Нягледзячы на ўсе доказы злачынстваў сілавікоў, ніводная крымінальная справа супраць вінаватых у катаваннях і/або жорсткім абыходжанні дагэтуль не распачатая.

Больш за тое, мы ведаем, што і сёння рэжым Лукашэнкі працягвае трымаць зняволеных у жорсткіх, катавальных умовах, мэтанакіравана пагаршаючы іх становішча і ўмовы знаходжання. У гэтым сэнсе паказальна, што «грамадскія» камісіі, якія праводзяць праверкі месцаў утрымання пад вартай, ніколі не знаходзяць парушэнняў ва ўмовах утрымання вязняў[3]. Выходзіць, што людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, не могуць разлічваць на справядлівасць з боку беларускай дзяржавы.

Сацыялагічнае даследаванне, прысвечанае ўспрыманню справядлівасці сярод тых, хто перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне ў Беларусі, дазваляе глыбей зразумець, як пацярпелыя бачаць правасуддзе, справядлівасць і аднаўленне сваіх правоў.

Для людзей, якія прайшлі праз катаванні і/або жорсткае абыходжанне, правасуддзе або справядлівасць часта звязаныя не толькі з пакараннем вінаватых, але і з прызнаннем пакут, забеспячэннем кампенсацыі і падтрымкай у працэсе рэабілітацыі. Разуменне таго, як такія людзі ўспрымаюць справядлівасць, дапамагае распрацоўваць палітыку і праграмы, якія сапраўды адпавядаюць іх патрэбам і жаданням.

Арыентацыя на жаданні і патрэбы пацярпелых — гэта ключавы аспект працэсу аднаўлення справядлівасці і пе-

*1 Коршунов, Г., Кудревич, М. Коллективная травма беларусского общества: масштабы и варианты проработки. ЦНИ, 2022.*

*2 Гл. «Общественное расследование массовых пыток в Центре изоляции правонарушителей города Минска 9–14 августа 2020 года», «Пытки во Фрунзенском РУВД г. Минска», «Как пытали политзаключенных в Беларуси в 2022 году», «Human Rights Watch: Всемирный доклад 2024: Беларусь» и др.*

*3 Barometer of repression in Belarus: I'2024.*

раходу да дэмакратыі ад дыктатуры. Без уліку думкі асобаў, якія перажылі катаванні, жорсткае абыходжанне і іншыя формы фізічнага і псіхалагічнага гвалту з боку прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, любыя намаганні могуць быць недастатковымі ці нават шкоднымі. Улічваючы галасы тых, хто пацярпелі, аказваецца неабходная падтрымка і ствараюцца ўмовы для поўнага аднаўлення пасля крызісу правоў чалавека ў Беларусі.

Уключэнне меркаванняў і досведу пацярпелых у працэс фармавання юрыдычных і праваабарончых захадаў з'яўляецца ключавым элементам пабудовы справядлівага і гуманнага грамадства. Іх галасы і гісторыі служаць важным інструментам для забеспячэння таго, каб правасуддзе не толькі адбылося, але і было ўспрынятае як справядлівае тымі, хто найбольш пацярпелі.

Паколькі крызіс правоў чалавека, які надышоў у Беларусі, надзвычай маштабны, можна выказаць сумнеў у тым, што ўсе пацярпелыя змогуць дамагчыся судовага пераследу сваіх «крыўдзіцеляў». Даследаванне чаканняў пацярпелых беларусаў і беларусак наконт дасягнення справядлівасці дапаможа быць упэўненымі ў тым, што існыя механізмы аднаўлення справядлівасці супадаюць з рэальнымі патрэбамі пацярпелых ад катаванняў і/або жорсткага абыходжання.

Рана ці позна Беларусь сутыкнецца з пераходам ад дыктатуры да дэмакратыі. Гэты працэс патрабуе дбайнай падрыхтоўкі і ўзважанага падыходу, каб стварыць устойлівае і справядлівае грамадства. Варта памятаць пра рызыку ажыццяўлення правасуддзя «пераможцамі». Часам пераходны перыяд можа стаць трыбунай выключна для голасу дэмакратычных лідараў, якія прыйшлі да ўлады, без уліку меркаванняў тых, хто перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, хто непасрэдна пацярпелі ад рэпрэсій дыктатарскага рэжыму.

Аўтары працы ўпэўненыя, што гэткія даследаванні не толькі спрыяюць разуменню цяперашняй сітуацыі, але і дапамагаюць у распрацоўцы доўгатэрміновых стратэгій для абароны правоў чалавека, фармавання калектыўнай памяці, прапрацоўкі траўмаў і недапушчэння такіх парушэнняў у будучыні.

У гэтым даследаванні мы пакажам, як успрымаецца меркаванне людзей, якія прайшлі праз катаванні, аб справядлівасці з пункту гледжання псіхалогіі і права. Мы разгледзім пацярпелых беларусаў і беларусак як суб'ект, на якога былі скіраваныя супрацьпраўныя паводзіны, «паставім» гэтых людзей у пазіцыю, што ўплывае на працэс аднаўлення справядлівасці, і агучым іх думку.

*Мы шукаем адказ на пытанне: «Як гэтыя людзі ўспрымаюць справядлівасць у сваім выпадку?»*

# Правасуддзе для людзей, якія перажылі катаванні

## Псіхалагічныя аспекты[4]

Правасуддзе як адзін з аспектаў аднаўлення справядлівасці не атрымала дастатковага прызнання і тэарэтычнага асэнсавання сярод практыкаў аховы здароўя. У выніку псіхалагічныя падыходы да розных формаў аднаўлення справядлівасці па сваёй сутнасці выразна не акрэсленыя. Значная ўвага ў псіхалагічнай літаратуры аб асобах, што перажылі катаванні, надзяляецца сувязі правасуддзя з рэабілітацыяй і аднаўленнем здароўя — як некалькім са складнікаў панятку *пакрыццё шкоды пацярпелым.*

Псіхасацыяльнае ўздзеянне катаванняў шырока вядомае і задакументаванае. Яно ўключае ў сябе эмацыйнае, кагнітыўнае, паводніцкае, экзістэнцыйнае, сацыяльнае і міжасабовае ўздзеянне на пацярпелых; а таксама сацыяльнае ўздзеянне і ўплыў на адносіны ў сям'і і шлюбнай пары, бацькоўскія адносіны пацярпелых з дзецьмі; найбольш шырокі ўплыў на супольнасці, у якіх жывуць пацярпелыя, і на грамадства ў цэлым[5].

Людзі, якія прайшлі праз катаванні, маюць права на спецыялізаваную і комплексную рэабілітацыю як форму пакрыцця шкоды. Пры гэтым «доступ да рэабілітацыйных праграм не павінен залежаць ад таго, ці звяртаецца пацярпелы па судовую абарону»[6]. Тым не менш ва ўсім свеце шмат людзей, якія перажылі катаванні, не могуць атрымаць доступ да правасуддзя або комплекснай, спецыялізаванай рэабілітацыі. Псіхалагічнае ўздзеянне адсутнасці доступу да правасуддзя і адсутнасці самога правасуддзя на людзей, якія перажылі катаванні, з'яўляецца ключом да разумення таго, як ва ўсім свеце ахвяры катаванняў працягваюць пакутаваць. Пры гэтым шмат хто з іх апісваюць адмову ў правасуддзі як «працяг катавання».

Шмат якія арганізацыі, што спецыялізуюцца на рэабілітацыі людзей, якія перажылі катаванні, падкрэсліваюць важнасць правасуддзя для рэабілітацыі і акрыяння пацярпелых. Напрыклад, спецыялісты медыцынскай рэабілітацыі прызнаюць, што адсутнасць правасуддзя перашкаджае псіхалагічнаму аднаўленню. Рэабілітолагі, якія працуюць з ахвярамі катаванняў на Філіпінах, таксама сцвярджаюць, што «адмова ў правасуддзі — гэта пастаянны раздражняльнік для псіхалагічных ран чалавека, які перажыў катаванні, [...] важнасць працы дзеля забеспячэння правасуддзя не павінна і не можа быць недаацэненая», а таксама «прадухіленне катаванняў і палітычнага гвалту з'яўляецца неад'емнай часткай праваабарончай працы у рамках паступальнага руху за грамадскія змены. [...] Калі грамадства, у якім жывуць [пацярпелыя ад

4 Гэты раздзел падрыхтавала Німіша Патэль, Professor of Clinical Psychology Professional Doctorate in Clinical Psychology Programme University of East London.

5 Patel, N. (2020) Psychological care for torture survivors, their families and communities. In M. Evans and J. Modvig (eds.) Research Handbook on Torture. Cheltenham: Edward Elgar; for reviews, see: Gurr, R. & Quiroga, J. (2001). Approaches to torture rehabilitation. Torture, 11(1) 1–35; Quiroga, J. & Jaranson, J.M. (2005). Politically-motivated torture and its survivors: A desk study review of the literature. Torture, 15(2–3), 1–112.

6 Комитет ООН против пыток, Замечание общего порядка № 3, 2012: Конвенция против пыток и других жестоких, бесчеловечных или унижающих достоинство видов обращения и наказания: применение статьи 14 государствами-участниками, CAT/C/GC/3, 19 ноября 2012 г., п. 15.

катаванняў], будзе працягваць спараджаць, падтрымліваць або ўчыняць парушэнні правоў чалавека, поўная рэабілітацыя ніколі не будзе магчымая»[7].

Крымінальнае расследаванне і пераслед асобаў, вінаватых у катаваннях, не толькі з'яўляюцца важным аспектам прынцыпу пакрыцця шкоды ў міжнародным праве, але і неабходныя дзеля таго, каб ахвяры маглі распачаць судовы разбор з мэтай пакрыцця шкоды і аднаўлення справядлівасці, а таксама адчуць, што яны іх атрымалі[8].

Існуе меркаванне, што «судовы пераслед і пакаранне служаць адплатай і выяўленнем маральнага асуджэння грамадства» і што «прыцягненне да адказнасці таксама надае значнасць пакутам ахвяр і служыць частковай кампенсацыяй, прадухіляючы акты помсты ды спрыяючы рэабілітацыі ахвяр»[9].

Забеспячэнне правасуддзя — расследаванне, судовы пераслед і пакаранне вінаватых — «супрацьлеглае таемнай прыродзе катаванняў як сродку ўціску: з публічным выкрыццём, прызнаннем і асуджэннем злачынных дзеянняў самі катаванні і іх выканаўцы губляюць сілу і легітымнасць»[10]. Для людзей, што прайшлі праз катаванні, правасуддзе можа перажывацца як публічнае і афіцыйнае асуджэнне гвалтоўных і шкодных дзеянняў дзяржаўных уладаў, якія спрабуюць прымусіць іх замаўчаць.

Уздзеянне адсутнасці правасуддзя на людзей, якія перажылі катаванні, часта апасродкавана іх уяўленнямі аб правасуддзі — што гэта такое, ці рэальнае яно і ці дасягальнае ва ўмовах іх краіны. Для шмат каго з іх ідэя правасуддзя зразумелая: «выправіць памылку», забяспечыць незалежнае расследаванне, пераслед і пакаранне, прыцягнуць вінаватых да адказнасці за прычыненую імі шкоду. Аднак у той жа час для шмат каго з пацярпелых правасуддзе — гэта абстракцыя, юрыдычная фармальнасць, недасяжная і недасягальная. У прыватнасці, так адбываецца там, дзе няма сродкаў доступу да правасуддзя, дзе злачынцы застаюцца ва ўладзе і дзе неабароненасць ад рэпрэсій робіць бессэнсоўным любое жаданне дамагацца правасуддзя, улічваючы пагрозу для жыцця іх саміх і іх блізкіх.

Адсутнасць законных і справядлівых механізмаў для пошуку правасуддзя і адсутнасць доступу да яго прыводзяць да таго, што ахвяры не вераць у магчымасць і дасяжнасць правасуддзя. Гэта азначае, што шмат людзей, якія зазналі катаванні, доўгія гады нясуць у сабе глыбокія пакуты, звязаныя з гэтым траўматычным досведам, і ў дадатак пакутуюць ад таго, што ім адмовілі ў правасуддзі (працяг катавання). Доступ да прававых механізмаў правасуддзя надзвычай важны з псіхалагічнага гледзішча, бо спрыяе ўсталяванню ісціны і справядлівасці, неабходных для паспяховага псіхалагічнага завяршэння[11].

У той жа час імкненне да правасуддзя і ўзаемадзеянне з механізмамі правасуддзя таксама можа быць крыніцай надзвычай моцнага стрэсу для пацярпелых і іх сем'яў. Для кагосьці прававыя механізмы могуць зрабіцца прычынай рэтраўматызацыі, хоць нярэдка пацярпелыя кажуць, што іх жаданне і рашучасць дамагчыся правасуддзя пераўзыходзяць траўму і боль, перажытыя падчас доўгіх і часам пакручастых шляхоў да правасуддзя.

Немагчымасць расказаць праўду для многіх людзей, якія перажылі катаванні, ператвараецца ў соль на іх раны. Замоўчванне гісторыі нанесенай шкоды як быццам адмаўляе ахвярам у самім існаванні, у іх чалавечнасці і пакутах, нібы іх не існуе і яны не маюць ніякага значэння. У шмат якіх людзей з такім досведам вера ў справядлівы свет разбураная; іх папярэднія ўяўленні аб даверы, маралі і аб тым, што значыць быць чалавекам, пастаўленыя пад сумнеў[12], а спробы дамагчыся правасуддзя ўяўляюцца марнымі.

Часам гэта выліваецца ў так званую змову маўчання паміж ахвярамі і грамадствам[13]. Праўда так і не выходзіць вонкі, беспакаранасць працягвае існаваць. Бяздзеянне грамадства, магчыма,

*7 Parong, A., Protacio-Marcelino, E., Estrada-Claudio, S., Pagaduan-Lopez, J. & Cabildo, V. (1992) Rehabilitation of survivors of torture and political violence under a continuing stress situation: The Philippine Experience. In M. Başoğlu (ed.) Torture and its consequences: current treatment approaches. Cambridge: Cambridge University Press. p. 505.*

*8 Ingelse, C. (2001) The UN Committee against Torture: An assessment. The Hague: Kluwer Law International.*

*11 Roht-Arriaza, N. (ed.) (1995) Impunity and human rights in international law and practice. New York/Oxford: Oxford University Press.*

*9 Ingelse, C. (2001) The UN Committee against Torture: An assessment. The Hague: Kluwer Law International.*

*10 Patel, N. (2011) Justice and reparation for torture survivors. Journal of Critical Psychology, Counselling and Psychotherapy, 11(3), 135–147.*

*12 Shelton, D. (2005) Remedies in International Human Rights Law, (2nd edition). Oxford: Oxford University Press. p. 396.*

*13 Danieli, Y. (1981) On the achievement of integration in aging survivors of the Nazi Holocaust. Journal of Geriatric Psychiatry, 14, 191–210; Danieli, Y. (1992) Preliminary reflections from a psychological perspective. In T. van Boven, C. Flinterman, F. Grunfeld and I. Westendorp (eds.) Seminar on the right to restitution, compensation and rehabilitation for victims of gross human rights and fundamental freedoms. Netherlands Institute of Human Rights, Studieen Informatiecentrum Mensenrechten, SIM Special No. 12. Maastricht: University of Limburg; Danieli, Y. (2009) Massive trauma and the healing role of reparative justice. Journal of Traumatic Stress, 22(5), 351–357.*

выкліканае распаўсюджаным страхам прычыніць шкоду, часта ўспрымаецца пацярпелымі як змова маўчання, як саўдзел грамадства ў дзяржаўным гвалце і адмаўленне дзяржавай сваіх дзеянняў. Гэта аказвае моцнае і глыбокае псіхалагічнае ўздзеянне на пацярпелых: калі ім не вераць, іх досвед выкрэсліваюць і ігнаруюць, ім адмаўляюць у правасуддзі, то для шмат каго гэта азначае падвойнае адмаўленне іх чалавечнасці — з боку дзяржавы і з боку грамадства.

Беспакаранасць вінаватых у катаваннях можа пагоршыць пачуццё бяссілля, віны і сораму ў тых, хто выжыў, паўплываць на іх веру ў будучыню і ўяўленне аб справядлівым грамадстве; яна «разбурае магчымасць аднаўлення этычных адносінаў паміж людзьмі ў грамадстве»[14].

Доўгая адсутнасць правасуддзя, часам на працягу многіх гадоў, можа таксама ўспрымацца як новы гвалт ці працяг старога, а таксама як траўма, што можа прывесці да адчужэння ад грамадства, а пасля — ізаляцыі і страты веры ў чалавецтва[15].

Адмова ў правасуддзі адбіваецца не толькі на пацярпелых, але і на іх сем'ях. Уздзеянне «хваляў шкоды»[16] распаўсюджваецца не толькі на самога чалавека, але і на чальцоў яго сям'і, закранаючы адносіны з роднымі — братамі і сёстрамі, бацькамі, дзецьмі, іншымі блізкімі. Сем'і часта перажываюць вялізныя ўзрушэнні, страх, канфлікты і другасныя траўмы, што, у сваю чаргу, можа паўплываць на тое, наколькі яны здольныя падтрымаць пацярпелых.

Пацярпелыя часта сутыкаюцца са складанасцямі ў бацькоўстве. Ім цяжка даць рады ўласным траўмам і псіхалагічным пакутам, што ўскладняе іх эмацыйную і фізічную прысутнасць для эфектыўнай падтрымкі і выхавання сваіх дзяцей. Гэта таксама можа адбіцца на дзецях пацярпелых, іх уласным псіхалагічным развіцці, уплываючы на наступныя пакаленні, што таксама вядома як міжпакаленчая траўма.

*14 Shelton, D. (2005) Remedies in International Human Rights Law, (2nd edition). Oxford: Oxford University Press. p. 396.*

*15 Doru, C. and Patel, N. (2016) «Justice fights like a dying man». Impunity and the process of survival: perspectives of Romanian torture survivors. Bucharest: ICAR Foundation.*

*16 Patel, N. (2020) Psychological care for torture survivors, their families and communities. In M. Evans and J. Modvig (eds.) Research Handbook on Torture. Cheltenham: Edward Elgar; for reviews, see: Gurr, R. & Quiroga, J. (2001). Approaches to torture rehabilitation. Torture, 11(1) 1–35; Quiroga, J. & Jaranson, J.M. (2005). Politically-motivated torture and its survivors: A desk study review of the literature. Torture, 15(2–3), 1–112.*

«Хвалі шкоды» ўплываюць і на грамадства, ствараючы ў ім атмасферу страху, павышанай пільнасці да любых пагрозаў або рэальнай небяспекі, падсілкоўваючы падазронасць адно да аднаго і сацыяльны недавер. Гэта, у сваю чаргу, спрыяе разбурэнню згуртаванасці і згоды ў супольнасцях, што потым адбіваецца на ўсіх сем'ях і, зноў жа, на пацярпелых[17].

*17 Patel, N. (2020) Psychological care for torture survivors, their families and communities. In M. Evans and J. Modvig (eds.) Research Handbook on Torture. Cheltenham: Edward Elgar; for reviews, see: Gurr, R. & Quiroga, J. (2001). Approaches to torture rehabilitation. Torture, 11(1) 1-35; Quiroga, J. & Jaranson, J.M. (2005). Politically-motivated torture and its survivors: A desk study review of the literature. Torture, 15(2-3), 1-112.*

*Такім чынам, адмова ў правасуддзі і далейшая беспакаранасць негатыўна адбіваюцца на здароўі і дабрабыце асобных пацярпелых, іх сем'яў, а таксама на будучым стане здароўя грамадства, сацыяльнай згуртаванасці і эфектыўным функцыянаванні суполак ды ўсяго грамадства цягам мноства гадоў і пакаленняў.*

# Правасуддзе для людзей, якія перажылі катаванні

## Юрыдычныя аспекты

Адным з кірункаў аднаўлення справядлівасці з'яўляецца выкарыстанне сродкаў прававой абароны. Само паняцце справядлівасці і механізмы яе дасягнення больш шырокія і суб'ектыўныя, чым сродкі прававой абароны. Так, напрыклад, для кагосьці справядлівасць дасягаецца помстай, ганьбаваннем, прабачэннямі, што не адносіцца да прававой сферы. Каротка разгледзім існыя прававыя механізмы дасягнення справядлівасці як на нацыянальным, так і на міжнародным узроўні.

Згодна з міжнародным публічным правам, любое супрацьпраўнае дзеянне, якое з'яўляецца парушэннем абавязанняў дзяржавы паводле міжнароднага права, цягне за сабой абавязанне пакрыць шкоду. Гэта робіцца дзеля таго, каб максімальна ліквідаваць наступствы парушэння і ўзнавіць тое становішча, што было б пры адсутнасці парушэння.

Пакрыццё шкоды праяўляецца ў рэстытуцыі, кампенсацыі і сатысфакцыі. Гэтыя сродкі могуць прымяняцца самастойна або ў спалучэнні адзін з адным.

***Рэстытуцыя*** — гэта аднаўленне становішча, якое існавала да парушэння. Напрыклад, вызваленне незаконна затрыманых асобаў, вяртанне супрацьпраўна канфіскаванай маёмасці, адмена незаконнай судовай меры.

***Кампенсацыя*** — гэта грашовая выплата за шкоду, нанесеную ў выніку правапарушэння, якую можна ацаніць. Кампенсацыя можа выплачвацца за прычыненне матэрыяльнай і/або маральнай шкоды, у тым ліку за страчаную выгаду.

***Сатысфакцыя*** — гэта дзеянні вінаватай дзяржавы для прызнання парушэння, выяўлення шкадавання, афіцыйныя прабачэнні. Сатысфакцыя таксама можа ўключаць законныя меры або пакаранне ў дачыненні да вінаватых асобаў.

### *Нацыянальныя сродкі прававой абароны*

З пазіцыі нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь існуюць матэрыяльныя і працэсуальныя падставы і магчымасці для аднаўлення справядлівасці ў гэтых трох кірунках, у тым ліку ў пытаннях адмены незаконных судовых і адміністрацыйных рашэнняў, кампенсацыі рознага кшталту шкоды і прыцягнення вінаватых да адказнасці. У той жа час розныя працэсуальныя нормы аб тэрмінах і парадку абскарджання вынесеных пастаноў у адміністрацыйных справах і прысудаў у крымінальных справах вызначаюць шырокія дыскрэцыйныя паўнамоцтвы пракуратуры і кіраўніцтва судоў ды робяць гэты працэс наўпрост залежным ад іх меркавання ў існай прававой рамцы.



***Больш складаная справа з вяртаннем супрацьпраўна канфіскаванай маёмасці.*** З розных прычын працэсуальнага і матэрыяльна-прававога характару найбольш рэальны варыянт — выплата кампенсацый.

Спагнанне ***кампенсацыі маральнай шкоды,*** у тым ліку душэўных і фізічных пакут, прычыненых пацярпелым, не абмяжоўваецца тэрмінам даўніны.

Шкода, прычыненая грамадзяніну, грамадзянцы або юрыдычнай асобе ў выніку незаконных дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўных органаў або службовых асобаў гэтых органаў, падлягае пакрыццю за кошт казны Рэспублікі Беларусь[18].

Шкода, прычыненая грамадзяніну ці грамадзянцы ў выніку незаконнага асуджэння і іншых відаў незаконнага пазбаўлення і абмежавання волі, абмежавання прафесійных правоў, пакрываецца за кошт казны Рэспублікі Беларусь, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, — за кошт казны адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў поўным аб'ёме незалежна ад віны службовых асобаў органаў крымінальнага пераследу і суда ў парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі[19].

Шкода, прычыненая пры ажыццяўленні правасуддзя, паводле існых правілаў, пакрываецца ў выпадку, калі віна суддзі вызначаная прысудам суда, які набыў законную моц[20].

## *Тэрміны даўніны*

Крымінальнае заканадаўства прадугледжвае магчымасць прыцягнуць да адказнасці без тэрміну даўніны за ***злачынствы супраць бяспекі чалавецтва*** — а менавіта так у асноўным павінны кваліфікавацца дзеянні вінаватых у катаваннях і актах жорсткасці ў сувязі з палітычнымі перакананнямі. У Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь гэтая адказнасць прадугледжаная ў адпаведнасці ***з артыкулам 128*** (Злачынствы супраць бяспекі чалавецтва): дэпартацыя, незаконнае ўтрыманне ў зняволенні, схіленне ў рабства, масавае ці сістэматычнае ажыццяўленне пакаранняў смерцю без суда, выкраданне людзей, з якога вынікае іх знікненне, ***катаванні або акты жорсткасці,*** што ўчыняюцца ў сувязі з расавай, нацыянальнай, этнічнай прыналежнасцю, палітычнымі перакананнямі і веравызнаннем грамадзянскага насельніцтва, караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або смяротнай карай.

Пры іншай кваліфікацыі дзеянняў вінаватых іх адказнасць можа быць аб-

*20 Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 939.*

*18 Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 938.*

*19 Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 939.*

межаваная тэрмінам даўніны прыцягнення — да дзесяці гадоў з моманту ўчынення злачынства, калі даўніна не перапыненая ўчыненнем іншага злачынства[21].

Орган, які вядзе крымінальны працэс, на патрабаванне рэабілітаванай асобы, якая мае права на кампенсацыю маральнай шкоды, абавязаны прынесці афіцыйныя прабачэнні за прычыненую шкоду, а таксама «накіраваць у сродкі масавай інфармацыі пісьмовае ўказанне аб абвяржэнні звестак, якія зневажаюць асобу, калі такія звесткі былі распаўсюджаны ў сродках масавай інфармацыі ў ходзе дасудовага або судовага вядзення па крымінальнай справе, а таксама паведамленне аб адмене незаконных рашэнняў па месцы працы, службы, вучобы або жыхарства гэтай асобы». У такім жа парадку прыносяцца прабачэнні ў выпадку рэабілітацыі ў адміністрацыйным працэсе[22].

## *Міжнародныя сродкі прававой абароны*

У адпаведнасці з Дакладам Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека «Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі напярэдадні і пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года», «некаторыя з парушэнняў [апісаныя ў дакладзе] могуць таксама прыраўняцца да злачынстваў супраць чалавечнасці, як яны вызначаныя ў міжнародным звычаёвым праве, калі такія дзеянні чыняцца ў рамках шырокамаштабнага або сістэматычнага нападу на любых цывільных асобаў, і калі такі напад чыніцца наўмысна»[23].

*Злачынствы супраць чалавечнасці* адносяцца да катэгорыі найбольш сур'ёзных крымінальных злачынстваў не толькі ў нацыянальным, але і ў міжнародным крымінальным праве. Такія злачынствы спалучаюць у сабе парушэнні цэлага комплексу правоў чалавека: права на жыццё, права на свабоду сходаў, аб'яднанняў, руху, права на прыватнае жыццё і нацыянальную прыналежнасць ды шэраг іншых правоў і свабодаў. Такім чынам, сродкі прававой абароны будуць уключаць у сябе не толькі крымінальную адказнасць асобаў, якія ўчынілі гэтыя злачынствы, але і шэраг іншых механізмаў, што існуюць для абароны таго ці іншага права, якое парушаецца ў працэсе ўчынення злачынства.

Ва ўмовах, калі дзяржава адмаўляецца даць сваім грамадзянам і грамадзянкам сродкі прававой абароны, а ў нашым выпадку — у асобе чыноўнікаў, якія незаконна ўтрымліваюць уладу ў краіне, з'яўляецца ініцыятарам і зацікаўленай асобай у гэтых злачынствах,

21 Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 83.

22 Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, арт. 465; Працэсуальна-выканаўчы кодэкс, арт. 15.4.

23 A/HRC/52/68

людзям краіны застаецца звяртацца толькі да міжнародных сродкаў праваВОЙ абароны.

У цяперашні час вінаватыя ў злачынствах супраць чалавечнасці могуць быць прыцягнутыя да адказнасці з дапамогай наступных механізмаў:

*Міжнародны крымінальны суд (МКС)*[24], заснаваны Рымскім статутам 17 ліпеня 1998 года. Гэты суд упаўнаважаны разглядаць злачынствы супраць чалавечнасці і ваенныя злачынствы, учыненыя на тэрыторыі дзяржаў, якія ратыфікавалі Рымскі статут. Хоць Беларусь не з'яўляецца дзяржавай-чальцом МКС, Міжнародны крымінальны суд мае юрысдыкцыю над злачынствамі, якія трапляюць пад Рымскі статут і адбываюцца, прынамсі часткова, на тэрыторыі яе суседзяў: Літвы, Латвіі і Польшчы. Услед за прэцэдэнтам, створаным МКС у сітуацыі з М'янмай/Бангладэш[25], МКС можа расследаваць і пераследваць за злачынствы супраць чалавечнасці, такія як дэпартацыя і пераслед, калі цывільныя асобы вымушаныя ўцякаць на тэрыторыю дзяржавы-ўдзельніцы. На падставе апошніх звестак[26,27,28], паводле Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, з 2020 года да 300 000 чалавек былі вымушаныя пакінуць Беларусь у выніку скаардынаванай кампаніі гвалту і рэпрэсій, наўмысна скіраванай супраць тых, хто выступае — або ўспрымаецца такімі — супраць урада або выказвае крытычнае ці незалежнае меркаванне[29].

*Міжнародны суд ААН*[30] — адзін з органаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Вырашае ў адпаведнасці з міжнародным правам юрыдычныя спрэчкі паміж дзяржавамі і дае кансультатыўныя высновы ў юрыдычных пытаннях. Згодна з арт. 34 Статута Міжнароднага суда ААН, бакамі ў справах, якія разглядаюцца гэтым судом, могуць быць толькі дзяржавы. Паколькі адказнасць за крымінальныя злачынствы павінна быць ускладзеная на фізічных асобаў, якія ўчынілі гэтае злачынства, а не на дзяржаву, якая не можа

24 https://www.icc-cpi.int/

25 Pre-Trial Chamber I of the Court, Decision on the Prosecution's Request for a Ruling on Jurisdiction under Article 19(3) of the Statute, ICC-RoC46(3)-01/18, 6 September 2018; https://isans.org/analysis/policy-papers/crimes-against-humanity-in-belarus-referral-to-the-international-criminal-court.html

26 https://www.europarl.europa.eu/doceo/document/TA-9-2023-0321_EN.html;
27 https://pace.coe.int/en/files/31822/html#_TOC_d19e303;
28 https://beroc.org/en/publications/working_papers/analysis-of-the-migrant-flow-from-belarus-to-the-eu-in-2021-2022-/;

29 A/HRC/52/68 пп. 53–54

30 https://www.icj-cij.org

з'яўляцца суб'ектам крымінальнага пераследу, то выкарыстанне гэтага механізму ў дачыненні да злачынстваў супраць чалавечнасці ў Беларусі ўяўляецца немагчымым. Аднак не выключаецца разгляд гэтым судом на пазовы іншых дзяржаў іншых парушэнняў Беларуссю абавязанняў, якія вынікаюць з міжнародных дамоваў, удзельніцай якіх з'яўляецца Беларусь і якія прадугледжваюць магчымасць перадачы спрэчкі ў Міжнародны суд, такіх як Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання (далей — Канвенцыя супраць катаванняў) і Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын. Такім чынам, напрыклад, Нідэрланды і Канада падалі пазоў супраць Сірыі аб парушэнні ёю Канвенцыі супраць катаванняў[31].

31 https://icj-cij.org/case/188

*Міжнародныя трыбуналы, якія ствараюцца Радай Бяспекі ААН.* Ажыццяўляюць судовы пераслед у дачыненні да асобаў, адказных за ўчыненне сур'ёзных злачынстваў у рамках міжнароднага гуманітарнага права, або ў выпадках, калі ўрад звяртаецца да Рады з просьбай аб аказанні дапамогі ў расследаванні і ажыццяўленні судовага пераследу. Стварэнне міжнародных трыбуналаў адбываецца паводле рашэння Рады Бяспекі ААН. Напрыклад, такія трыбуналы ствараліся па былой Югаславіі[32] і па Руандзе[33].

32 https://www.icty.org/

33 https://www.un.org/ru/law/ictr/

Згодна з арт. 27 Статута ААН, рашэнні Рады Бяспекі лічацца прынятымі, калі за іх пададзеныя галасы дзевяці чальцоў Рады, уключаючы супадаючыя галасы ўсіх пастаянных чальцоў Рады. У адпаведнасці з арт. 23 Статута ААН, Кітайская Народная Рэспубліка, Францыя, Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (пераемнікам аб'явіла сябе Расійская Федэрацыя), Злучанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ды Злучаныя Штаты Америкі з'яўляюцца пастаяннымі чальцамі Рады Бяспекі. У цяперашняй палітычнай сітуацыі стварэнне трыбунала для Беларусі з'яўляецца малаімаверным, бо такія пастаянныя чальцы Рады Бяспекі, як Расійская Федэрацыя і Кітай, наўрад ці падтрымаюць такую ініцыятыву.

*Міжнародныя трыбуналы ствараюцца дзяржавамі, пад юрысдыкцыю якіх трапляюць учыненыя злачынствы.* Напрыклад, такім трыбуналам з'яўляўся Міжнародны ваенны трыбунал у Нюрнбергу, заснаваны ў адпаведнасці з пагадненнем, заключаным паміж урадамі СССР, ЗША і Вялікабрытаніі ды Часовым урадам Францыі[34].

34 http://www.icls.de/dokumente/imt_statute.pdf

*Змяшаныя (гібрыдныя) трыбуналы.* Гэтыя трыбуналы з'яўляюцца нацыянальным судовым органам з міжнародным элементам, парадак дзейнасці і юрысдыкцыя якіх вызначаюцца сукупнасцю нормаў міжнароднага і нацыянальнага права. У працы такіх судоў нароўні з нацыянальнымі прымаюць удзел міжнародныя суддзі. Адзін з вядомых гібрыдных трыбуналаў — Спецыяльны суд па Сьера-Леонэ, заснаваны на падставе Пагаднення паміж Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый і ўрадам Сьера-Леонэ[35].

35 https://www.un.org/ru/documents/bylaws/charter_sierra.pdf

*Універсальная юрысдыкцыя.* Гэты механізм, па сутнасці, не адносіцца да міжнародных, бо прадугледжвае прыцягненне да адказнасці згодна з унутраным крымінальным заканадаўствам дзяржавы. Аднак у гэтым выпадку правасуддзе адбываецца не ў краіне ўчынення злачынства, а ў іншай дзяржаве, у якой нормы крымінальнага заканадаўства дазваляюць прыцягваць да адказнасці за асабліва цяжкія злачынствы (да якіх адносяцца злачынствы супраць чалавечнасці), незалежна ад месца іх учынення. Пры гэтым нормы заканадаўства розных краін могуць змяшчаць дадатковыя ўмовы для прымянення ўніверсальнай юрысдыкцыі. Напрыклад, знаходжанне падазраваных (Швейцарыя) або пацярпелых (Францыя) на тэрыторыі гэтай дзяржавы. Так, аргентынскі суд разглядае міжнародныя злачынствы ўладаў М'янмы супраць рахінджа[36], а ў пачатку 2022 года нямецкі суд прысудзіў сірыйца Анвара Р. да пажыццёвага зня-

36 https://www.globaljusticecenter.net/ru/qa-the-universal-jurisdiction-case-against-myanmar/

воленні. Так завяршыўся першы ў свеце крымінальны працэс аб дзяржаўных катаваннях у Сірыі[37].

У цяперашні час справа паводле ўніверсальнай юрысдыкцыі адносна пацярпелых падчас і пасля пратэстаў 2020 года ў Беларусі распачатая ў Літве, заканадаўства якой не прадугледжвае ніякіх асаблівых умоваў для прымянення ўніверсальнай юрысдыкцыі[38].

Таксама крымінальная справа адносна згаданых падзей распачатая ў Польшчы, аднак пацярпелымі ў ёй былі прызнаныя толькі грамадзяне гэтай краіны. У лістападзе 2023 года Польшча прыпыніла расследаванне аб незаконным пазбаўленні волі трох палякаў, затрыманых у Мінску пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня 2020 года з прымяненнем да іх катаванняў, у сувязі з адмовай беларускага боку супрацоўнічаць[39].

37 https://www.deutschland.de/ru/topic/politika/princip-universalnoy-yurisdikcii-v-germanii-delo-o-pytkakh-v-sirii

38 https://www.prokuraturos.lt/lt/pre-trial-investigation-launched-into-possible-torture-of-a-person-in-a-foreign-state/7240

39 https://www.rmf24.pl/fakty/polska/news-sledztwo-ws-pobitych-polakow-zawieszone-bialorus-odmowila-ws,nld,7121277#crp_state=1

# Метадалогія даследавання

Аб'ектам нашага даследавання сталі беларусы і беларускі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне з боку сілавікоў пасля падзей 2020 года.

Мы не ведаем ні дакладнай колькасці такіх людзей, ні іх полаўзроставай, ні адукацыйна-прафесійнай структуры. Яны не пражываюць кампактна ў нейкіх месцах і звычайна не ствараюць асобных суполак. А некаторыя пацярпелыя проста адмаўляюць і хочуць забыць свой траўмуючы досвед. Гэтыя моманты істотна ўскладняюць даследчы кантакт з мэтавай групай і накладаюць пэўныя абмежаванні на вывучэнне аб'екту даследавання.

З іншага боку, мы маем амаль ідэальную сітуацыю. Праваабаронцы — праваабарончы цэнтр «Вясна» і Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі (далей: «Вясна» і МКРК) — маюць верыфікаваныя базы дадзеных асобаў, якія з'яўляюцца нашым аб'ектам даследавання. Гэтыя базы пачалі стварацца ў 2020 годзе і папаўняюцца дагэтуль; усяго ў дзвюх базах дадзеных налічваецца больш за 3000 запісаў.

Інфармацыю, сабраную праваабаронцамі і аб'яднаную ў адну базу дадзеных пацярпелых ад гвалту (катаванняў і/або жорсткага абыходжання), мы разглядаем як своеасаблівы — не ідэальны, але цалкам рэлевантны — зрэз усёй нашай мэтавай групы, то бок беларусаў і беларусак, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне з боку сілавікоў пасля падзей 2020–2021 гадоў.

Пры гэтым мы разумеем і ўлічваем абмежаванні, якія ўзнікаюць пры спробах экстрапаляваць атрыманыя з гэтай базы дадзеныя на ўсю генеральную сукупнасць людзей, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне ў Беларусі ў апошнія гады.

*У якасці прадмета даследавання разглядаецца ўспрыманне справядлівасці як ступені адпаведнасці існага належнаму, як неабходнасць наступстваў для дзеянняў (роўна для суб'ектаў дзеянняў), якія парушаюць гэтую ступень.*

У нашым выпадку структурна-працэсуальная схема справядлівасці як прадмета даследавання мае наступны выгляд:

- ***Этап 0:*** сітуацыя існавання адпаведнасці належнага існаму;

- ***Этап 1:*** парушэнне раўнавагі праз ужыванне катаванняў і/або жорсткага абыходжання адных людзей у адносінах да іншых;
- ***Этап 2:*** спробы аднавіць сітуацыю адпаведнасці належнага існаму з дапамогай пэўных дзеянняў.

Нулявы этап мы не разглядаем. Этап 1 і яго галоўныя складнікі: гвалт і людзі, хто яго перажылі, — рэалізаваны раней, што зафіксавана ў верыфікаванай базе дадзеных. Тут мы звернем увагу не на сам гвалт, а на тых, хто яго чыніў і хто павінны несці за гэта адказнасць.

Разам з тым базавым этапам для нас з'яўляецца этап 2 — рашэнні аб дзеяннях для аднаўлення справядлівасці (факт (не)рашэння, матывацыя), уяўленні аб належным і дзеянні для яго дасягнення (магчымыя/пажаданыя, суб'екты, перашкоды).

*Такім чынам, мэтай даследавання было выяўленне і апісанне таго, якая павінна быць справядлівасць адносна сітуацый катаванняў і/або жорсткага абыходжання з боку людзей, якія гэта перажылі.*

Дзеля дасягнення пастаўленай мэты былі вырашаныя наступныя задачы:

— скласці спіс вінаватых у несправядлівасці (катаваннях і/або жорсткім абыходжанні);

— вызначыць, у чым палягае справядлівасць (у дачыненні да розных суб'ектаў);

— вывучыць досвед, матывацыю і перашкоды для дасягнення справядлівасці.

У якасці дадатковай задачы разглядалася неабходнасць выявіць асноўныя праблемы, з якімі сутыкаюцца асобы, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, і спосабы ды суб'екты іх вырашэння.



# Методыка

Даследаванне насіла комплексны характар і складалася з двух даследчых этапаў: ***якаснага*** (кваліатыўнага) і ***колькаснага*** (кантытатыўнага).

На першым этапе была праведзеная серыя глыбінных інтэрв’ю. Рэспандэнтамі_камі сталі людзі з верыфікаванай базы дадзеных асобаў, якія перажылі гвалт (катаванні і/або жорсткае абыходжанне); рэкрутацыя рэспандэнтаў_ак адбывалася выпадковым чынам па абедзвюх частках базы дадзеных «Вясны» і МКРК.

Глыбінныя інтэрв’ю былі праведзеныя метадам CATI на працягу траўня 2024 года, усяго было апытана 12 чалавек. Атрыманая выбарка мела наступную пабудову:

Гендар



Узрост




Адукацыя




Перыяд катаванняў




(адзін рэспандэнт мог/адна рэспандэнтка магла неаднаразова зазнаваць і/або жорсткае абыходжанне)

Як мінімум 2 чалавекі з апытаных мелі статус былых палітзняволеных. Былі людзі як з досведам «хатняй хіміі», СІЗА, калоніі, так і ўвогуле без досведу знаходжання ў месцах абмежавання волі.

У справаздачы цытаты з глыбінных інтэрв'ю падаюцца ў ананімізаваным фармаце, словы рэспандэнтаў і рэспандэнтак маюць атрыбуцыю толькі паводле гендару, узроставай групы, адукацыі і году ад'езду з Беларусі. Непасрэдна ў тэксце цытаты падпісаныя словам «Рэспандэнт_ка» і парадкавым нумарам, атрыбуцыі рэспандэнтаў_ак пададзеныя ў Дадатку.

Галоўнай мэтай якаснага этапу даследавання быў збор першаснай нефармалізаванай інфармацыі з боку асобаў, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, аб справядлівасці ў дачыненні да перажытага імі дзеля далейшай фармалізацыі і распрацоўкі рэлевантнага інструментара для колькаснага даследавання.

Гэтая мэта была дасягнутая, разам з тым была атрыманая дадатковая карысная для даследавання інфармацыя, якая ўвайшла ў адпаведную частку раздзела «Вынікі даследавання».

Другі этап праекту — колькаснае даследаванне. Як і ў выпадку з глыбіннымі інтэрв'ю, рэкрутацыя рэспандэнтаў і рэспандэнтак адбывалася выпадковым чынам[40] з базы дадзеных «Вясны» і МКРК. Апытанне праходзіла з 19 чэрвеня да 19 ліпеня 2024 года.

Метад збору інфармацыі — анкетаванне-CAWI[41]. Усяго было апытана 580 чалавек. Атрыманая выбарка мела наступную пабудову:

40 Два поўныя цыклы рэкрутацыі са зрухам этапу адбору ў абедзвюх частках базы.

41 У некаторых выключных выпадках замест анкеты CAWI выкарыстоўвалася інтэрв'ю CATI.



Геаграфічнае размеркаванне рэспандэнтаў і рэспандэнтак з'яўляецца найшырэйшым, пры гэтым да гэтага часу 18% апытаных застаюцца ў Беларусі. Асноўнымі замежнымі краінамі, дзе знаходзіліся рэспандэнты_кі, былі: Польшча — 47%, Літва — 15%, Нямеччына — 4% і Грузія — 3%.

Тыя, хто выехалі з Беларусі, у асноўным зрабілі гэта ў 2021 ці ў 2022 годзе (24% і 31% адпаведна). У 2020 годзе з'ехала 8%, у 2023 — 13%, у 2024-м — 5%.



# Вынікі даследавання

У гэтым раздзеле прадстаўленыя звесткі, сабраныя як у глыбінных інтэрв'ю, так і ў колькасным даследаванні. Адрозненне метадаў палягае ў тым, што: а) падчас глыбінных інтэрв'ю рэспандэнт_ка самастойна разважае і адказвае на пытанні інтэрв'юера_кі, без прапанаваных варыянтаў адказу або якіх-небудзь сэнсавых падказак; б) адказваючы на пытанні анкеты колькаснага даследавання, рэспандэнт_ка выбірае варыянты адказаў з прапанаванага спісу, то бок з «падказкамі» і абмежаваннямі.

Пачаць варта з таго, што з вынікаў аналізу глыбінных інтэрв'ю складаецца агульнае ўражанне, што на цяперашні момант для рэспандэнтаў_ак пытанне аднаўлення справядлівасці стаіць далёка не на першым месцы. Гэта звязана і з перыядам часу, які мінуў пасля гвалту, і з неабходнасцю неяк выжываць проста цяпер.

*— Вядома, я хацеў (аднавіць справядлівасць). Але чым больш гэта працягваецца, тым менш ёсць веры ў гэта. Кажу як ёсць.*

Рэспандэнт_ка 1

Яшчэ адзін важны чыннік, які з большага выцясняе пытанне аднаўлення справядлівасці за межы актуальнага фокусу ўвагі, — гэта ўсведамленне адсутнасці магчымасцяў аднавіць справядлівасць у найбліжэйшай перспектыве. Прычым як непасрэдна ў краіне, так і за яе межамі. Паводле колькаснага апытання, 84% рэспандэнтаў_ак лічаць шанцы дамагчыся справядлівасці ў найбліжэйшы час у Беларусі нулявымі або невысокімі. Адносна іншых краін і міжнародных арганізацый такая доля складае 64%.



*— Вось проста цяпер я лічу, што гэта вельмі малаімаверна. У нейкай гістарычнай перспектыве, там, не ведаю, 10 гадоў, ці, можа, нават больш, тады так, як бы, чаму не... Я слаба сабе ўяўляю, якім чынам нейкія міжнародныя арганізацыі могуць прыцягнуць нейкіх канкрэтных людзей, якія цяпер знаходзяцца ў Беларусі на службе рэжыму, да нейкай адказнасці.*

Рэспандэнт_ка 2

*— Калі шчыра, не бачу нейкіх механізмаў, якія маглі б паўплываць цяпер на ўсіх. Можа, нешта зменіцца, але цяпер я не бачу такой магчымасці.*

Рэспандэнт_ка 3

Разам з гэтым, у колькасным даследаванні мы атрымалі лічбы, якія сведчаць аб тым, што пытанне аднаўлення справядлівасці не страчвае сваёй актуальнасці. Пераважная большасць апытаных мяркуюць, што іх прага справядлівасці не аслабла, а 29% сцвярджаюць, што яна нават павялічылася.

Размеркаванне адказаў на пытанне «Якое з наступных сцвярджэнняў вам бліжэйшае?»




Пры гэтым, як паказваюць дадзеныя, тая частка рэспандэнтаў_ак, што настроеная больш праактыўна, колькасна ў 2-2,5 разы большая за тых, хто хоча, каб «усё гэта проста неяк спынілася».

Размеркаванне адказаў на пытанне «Ці змянялася пасля 2020 года вашае ўспрыманне справядлівасці? І калі змянялася, то ў які бок?»




Галоўная перашкода для аднаўлення справядлівасці — тое, што ў цяперашні момант людзі проста не бачаць для гэтага магчымасцяў.

*— Калі раней можна было апеляваць да нейкіх прававых нормаў, законаў і гэтак далей, то ў апошні час само згадванне закона цягне гадоў на восем.*

Рэспандэнт_ка 4

*— Тэарэтычна я хацеў бы прыцягнуць гэтых людзей да адказнасці, але практычныя механізмы, праз якія можна гэтага дасягнуць, мне, напрыклад, вось проста цяпер яны не зусім вядомыя.*

Рэспандэнт_ка 2

*— ...пакуль існуе сітуацыя такая, як цяпер, гэта (справядлівасць) увогуле немагчыма. Пакуль існуе сувязь з Расіяй, гэта таксама немагчыма. І нават калі зменіцца там, не ведаю, нейкае кіраўніцтва сённяшняе, калі ёсць такая сувязь з Расіяй, то гэта будзе ну больш-менш тое самае.*

Рэспандэнт_ка 5

У вольных адказах на пытанні глыбінных інтэрв'ю дамінуе меркаванне, і гэта для рэспандэнтаў_ак прынцыпова, што базавай прасторай справядлівасці і базавым суб'ектам, у дачыненні да якога гэтая справядлівасць павінна

быць адноўленая, з’яўляецца не пэўная асоба або супольнасць пацярпелых ад гвалту ў розных яго праявах. ***Такой прасторай і такім калектыўным цэлым з’яўляецца краіна Беларусь.*** Гэта азначае, што аднаўленне справядлівасці і законнасці — гэта ў асноўным не столькі індывідуальнае пытанне, колькі калектыўная справа, задача скідання рэжыму і вяртання на радзіму (ці хаця б магчымасць туды ездзіць).

*— Гэты рэжым павінен панесці адказнасць, паўстаць перад судом. Тыя людзі, хто ўсё гэта рабілі, мусяць атрымаць пакаранне.*

Рэспандэнт_ка 10

*— ...хацелася б, каб яна, вось сітуацыя сама вырашылася ў пазітыўны бок. Каб можна было вярнуцца, вольна перасоўвацца, не баяцца, што тамака адразу пасадзяць... Не баяцца за сваіх родных, што да іх там дадому прыйдуць і... што могуць зрабіць. Каб правакацый вось гэтых не было. Каб быць упэўненым, што ўсё спакойна.*

Рэспандэнт_ка 6

На індывідуальным узроўні ў рэспандэнтаў_ак галоўнай задачай цяпер з’яўляецца выжыць, у гэтай логіцы справядлівасць успрымаецца адкладзенай раскошай.

*— Я рабіў спробы максімальна хутка пакінуць Беларусь, бо гэта было для мяне больш прыярытэтна. Ніякіх спробаў дамагчыся справядлівасці, акрамя аповедаў пра сваю гісторыю максімальна публічна, я не рабіў.*

Рэспандэнт_ка 2

Пры гэтым нельга казаць, што яна — справядлівасць — скінутая з рахунку. Яна, безумоўна, існуе як мэта і матыў дзейнасці, але не тут і цяпер. Нешта ў гэтым напрамку было зроблена ў мінулым, нешта робіцца на будучыню — для дзеянняў у Новай Беларусі, дзеля пакарання і люстрацыі вінаватых.

*— Рана ці позна ўсё гэта скончыцца і павінна быць люстрацыя. У маім успрыманні гэта так.*

Рэспандэнт_ка 1

*— ...на кожную прапанову, якую я атрымліваў, напрыклад, як ад «Вясны» для дакументацыі,.. ад прадстаўнікоў ААН... нехта там пісаў кнігу... Я так ну адразу згаджаўся на гэта. Бо гэта мой такі асабісты ўнёсак у тое, каб хаця б задакументаваць гэтую несправядлівасць, якая адбывалася і адбываецца. Ну і спадзяваецца, што нешта калі-небудзь можа змяніцца і, можа, тыя людзі, хто ўсё гэта зрабілі, нейкую адказнасць некалі панясуць.*

Рэспандэнт_ка 5

Калі казаць пра колькасныя паказчыкі, то дзеля аднаўлення справядлівасці людзі, якія прайшлі праз гвалт, насамрэч робяць даволі шмат (прынамсі, рэспандэнты_кі нашага даследавання)[42].

У прыватнасці, пераважная большасць апытаных зафіксавалі тое, што з імі адбывалася, для будучага разбору. Людзі спрабавалі нешта рабіць і ў краіне, і за яе межамі: распаўсюджвалі інфармацыю аб гвалце і катаваннях у Беларусі шляхам інтэрв’ю праваабаронцам, даследчыкам, медыям; удзельнічалі ў розных грамадскіх ініцыятывах і тым самым набліжалі час узнаўлення справядлівасці; кантактавалі з міжнароднымі і беларускімі праваабарончымі арганізацыямі і шмат іншага.

Толькі 7% пазначылі, што ніякіх спробаў для аднаўлення справядлівасці не рабілі. Насамрэч і яны рабілі — напрыклад, зафіксавалі ўсё тое, што з імі адбывалася ў Беларусі. Гэта спецыфіка выбаркі. Тут, мусіць, мы назіраем своеасаблівы ахоўны механізм, калі ўсё, звязанае з непажаданымі ўспамінамі, выціскаецца з памяці. Альбо гэтая частка рэспандэнтаў_ак зафіксавала факты катаванняў і/або жорсткага абыходжання проста з пачуцця нейкага абавязку, без надзеі на справядлівасць.

Песімістычны погляд на перспектывы аднаўлення справядлівасці — не адзі-

*42 Неабходна ўлічваць спецыфіку выбаркі, якая была сабраная з праверанай базы дадзеных людзей, якія зазналі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, то бок ужо прынялі пэўныя захады да аднаўлення справядлівасці.*

Размеркаванне адказаў на пытанне «Ці рабілі вы якія-небудзь спробы дамагчыся справядлівасці?»
(можна было абраць некалькі варыянтаў адказу)




ны дэматыватар на гэтым шляху. У пэўным сэнсе, важнейшым фактарам з'яўляецца фактар бяспекі. На пражэктыўнае пытанне аб тым, чаму людзі не робяць спробаў дамагчыся справядлівасці, пераважная большасць апытаных згадала, што маюць асцярогі за бяспеку родных. Гэта найважнейшы чыннік, яго абралі 85%. На трэцім месцы таксама пытанне бяспекі, але ўжо асабістай: пазіцыю «Людзі баяцца помсты з боку сілавікоў» паказалі 62% апытаных. А пра тое, што няма «сэнсу шукаць справядлівасці ў Беларусі», сказалі 76% рэспандэнтаў_ак.

Таксама важна, што больш за палову людзей адказалі, што існуе праблема, звязаная з адсутнасцю інфармацыі аб тым, як працуюць тыя ці іншыя механізмы аднаўлення правасуддзя (58%). У прыватнасці, людзі могуць не ведаць, як можна дамагацца справядлівасці з дапамогай міжнародных арганізацый. Аб гэтым сказалі 51% апытаных.

Яшчэ амаль палова рэспандэнтаў_ак згадалі такую «песімістычную» пазіцыю, як адсутнасць рэальнай зацікаўленасці іншых краін і міжнародных арганізацый у аднаўленні справядлівасці ў дачыненні да тых беларусаў і беларусак, якія пацярпелі ад катаванняў і/або жорсткага абыходжання ў Беларусі.

Размеркаванне адказаў на пытанне «Як вы думаеце, чаму частка людзей, якія прайшлі катаванні і/або жорсткае абыходжанне, не робяць спробаў дамагчыся справядлівасці?» (можна было абраць некалькі варыянтаў адказу)




А 42% адзначылі, што людзей можа адпужваць доўгі шлях у барацьбе за справядлівасць.

Пры гэтым усё ж такі прысутнічае вера ці жаданне аднаўлення справядлівасці ва ўмоўна гістарычным плане.

*— ...нешта я спрабаваў рабіць у моманце. Гэта поспехам не скончылася. А ўсе наступныя мае дзеянні... У выніку я прыйшоў да таго, што не тое каб я нейкую справядлівасць спрабаваў гэтым аднавіць. Хутчэй, з пункту гледжання нейкай сусветнай праўды, я зрабіў нешта добрае. З гледзішча нейкай асабістай сітуацыі, мусіць, не. І не надта ўяўляю, як гэта магчыма ў цяперашняй сітуацыі.*

Рэспандэнт_ка 7

Увасабленнем такой «гістарычнай справядлівасці» для апытаных будзе скіданне рэжыму Аляксандра Лукашэнкі: спыненне рэпрэсій, дэмакратызацыя краіны і вяртанне на радзіму ўсіх ахвочых.

*— Тысячы тых, хто цяпер сядзяць у турмах, — ну справядлівасць павінна быць такая, што гэтыя людзі, па-першае, павінны мець свабоду. Па-другое, яны павінны нібыта мець нейкую кампэнсацыю за тое, што яны атрымалі з боку гэтага рэжыму. Ну а трэцяе, вядома, гэты рэжым павінен панесці адказнасць, паўстаць перад судом. Тыя людзі, хто ўсё гэта рабіў, павінны панесці нейкае пакаранне.*

Рэспандэнт_ка 5

Тут дамінуе абагульненае ўяўленне аб вінаватым баку — гэта ўлада, сістэма, рэжым Лукашэнкі.

*— ...(вінаватыя тыя), хто прымаў рашэнні, хто выконваў, хто забіваў, хто збіваў людзей. Гэта значыць, што прадстаўнікі ўлады, прадстаўнікі сілавікоў і розных вайсковых структур, якія ўдзельнічалі ва ўсім. Ну і таксама калі вяртацца да выбараў — таксама гэта тыя, хто браў удзел у фальсіфікацыі. Ну як бы цэлая сістэма гэтая.*

Рэспандэнт_ка 5

Вінаватыя ў гвалце ўспрымаюцца рэспандэнтамі_камі амбівалентна: з аднаго боку — дэперсаналізавана, ад рэжыму ўвогуле да шараговых сілавікоў і чальцоў участковых камісій; з іншага — персаналізавана, як першая асоба дзяржавы.

*— Вінаватыя ў тым, што мне давялося збегчы з краіны, — гэта тыя людзі, якія скарысталіся сваёй уладай і не выконвалі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.*

Рэспандэнт_ка 11

*— ...аж да малых гарадскіх чыноўнікаў, яны таксама павінны прысесці.*

Рэспандэнт_ка 12

*— Вінаваты кожны, хто чыніў злачынствы, катаванні, той, хто дапамагаў утрымліваць уладу незаконнаму рэжыму Лукашэнкі. Ну і Лукашэнка як асноўны вінаваты.*

Рэспандэнт_ка 9

Калі вылучыць пэўную іерархію вінаватых у гвалце і тых, хто павінны несці адказнасць за гэта, то галоўны вінаваты — гэта рэжым як сістэма, а галоўны, хто павінен несці адказнасць, — Аляксандр Лукашэнка.



На ўмоўным трэцім месцы — беларускія суды, на чацвёртым — генералы-сілавікі, пятае месца — пракуратура і следчы камітэт. За імі ідуць супрацоўнікі_цы ІЧУ/СІЗА/ПК/ПУАТ[43], затым — усе, хто фальсіфікаваў выбары, і шараговыя сілавікі.

Што тут звяртае на сябе ўвагу, дык гэта высокае месца судоў у іерархіі вінаватых у гвалце. Прэтэнзіі да судовай сістэмы, якая павінна быць гарантам вяршэнства права, аказваюцца значна больш важкія, чым патрабаванні адказнасці да тых, хто непасрэдна ўчыняў гвалт. Здаецца, гэта вельмі важна: патрабаванні справядлівасці маюць сістэмны характар з акцэнтам на законнасць.

У гэтым сэнсе цалкам заканамернымі выглядаюць развагі рэспандэнтаў_ак аб тым, што рэжым павінен панесці пакаранне таксама сістэмнага тыпу — яго варта дэканструяваць, прычым так, каб у далейшым падобнае абыходжанне з грамадзянамі_камі не паўтарылася. І тут маецца на ўвазе не толькі непасрэдны гвалт, але і нашмат шырэйшае паняцце — парушэнне правоў чалавека.

*— ...выплата кампенсацыі, яна больш такая, прыватная, што тычыцца толькі мяне. А пакаранне — гэта нясе ўжо больш такую грамадскую, выконвае ролю зацвярджэння грамадскай справядлівасці або страхоўкі таго, што больш такога не будзе паўтарацца.*

Рэспандэнт_ка 9

*— Патрэбен нейкі канкрэтны прыклад, каб будучым пакаленням засталося гэта ў памяці — разуменне, што так дакладна не варта рабіць, што трэба мець сваё разуменне і не падпісвацца на ўсялякія зверствы...*

Рэспандэнт_ка 6

*— Калі казаць пра справядлівасць, не павінна быць такога рэжыму, не павінна быць такіх людзей, не павінна быць такіх уладаў, асобаў ва ўладзе, таму што гэта ўсё несправядліва, з таго пункту гледжання, што людзі не маюць права выказваць свае думкі, рабіць справы на карысць дзяржаве і грамадству.*

Рэспандэнт_ка 4

Несумненна, лічыцца важным пакаранне не толькі рэжыму ўвогуле, але і канкрэтных асобаў, вінаватых у гвалце. І тут мы бачым сітуацыю, якая зноў уводзіць у фокус увагі законнасць. Згодна з атрыманымі намі звесткамі, пераважная большасць апытаных, то бок людзей, якія перажылі гвалт і/або жорсткае абыходжанне, гавораць, што агульнага абвінавачання быць не можа. Ступень віны кожнага_ай павінен вызначаць суд у строга індывідуальным парадку — такую пазіцыю вызначылі 84% апытаных. У якасці (абавязковага) дапаўненя трэба разглядаць патрабаванне люстрацыі як забароны асобам, вінаватым у гвалце, займаць пэўныя пасады і/або займацца пэўнымі відамі дзейнасці — гэтую пазіцыю ўказалі 56% рэспандэнтаў_ак.

Пры гэтым 16% апытаных выказалі максімальна гуманістычную пазіцыю, сутнасць якой палягае проста ў факце прызнання вінаватымі, можна без строгага пакарання.

*43 ІЧУ/СІЗА/ПК/ПУАТ — ізалятар часовага ўтрымання / следчы ізалятар / папраўчая калонія / папраўчая ўстанова адкрытага тыпу.*

Размеркаванне адказаў на пытанне «Калі казаць аб тым, што вы перажылі, што для вас азначае справядлівасць у дачыненні да вінаватых у тым, што здарылася?»
(можна было абраць некалькі варыянтаў адказу)




Размеркаванне адказаў на пытанне «Хто ў першую чаргу павінен вызначыць тып і ступень адказнасці вінаватых у тым, што здарылася?»
(можна было абраць некалькі варыянтаў адказу)



У той жа час ёсць прыхільнікі стражэйшых варыянтаў пакарання. Так, 47% апытаных выказаліся за тое, каб вінаватыя панеслі пакаранне, звязанае з пазбаўленнем волі; 29% адзначылі пакаранне, звязанае з пазбаўленнем маёмасці; 9% указалі, што ўсе вінаватыя павінны панесці фізічнае пакаранне, магчыма, нават смяротнае.

Калі гаварыць аб тым, хто павінен непасрэдна вызначаць ступень віны канкрэтных асобаў, то тут рэспандэнты_кі бачаць фактычна толькі два варыянты: альбо Міжнародны трыбунал, які трэба арганізоўваць ужо цяпер (так кажуць 46% апытаных), альбо чакаць змены ўлады ў Беларусі і тады ладзіць адкрытыя суды саматугам (гэты варыянт абралі 34%). Іншыя варыянты, такія як суды паводле ўніверсальнай юрысдыкцыі, амаль не разглядаюцца.

Іншы бок справядлівасці — гэта меры ў дачыненні да тых, хто перажылі рознага кшталту гвалт. Сітуацыя складаецца няпростая, таму што, з аднаго боку, складана ўявіць, якія праявы гэтая справядлівасць можа мець, а з іншага — людзі ўсё роўна часцей гавораць аб справядлівасці на грамадскім, а не на індывідуальным узроўні, прынамсі, у глыбінных інтэрв'ю.

*– Думаю, што пачынаць з таго, што павінны быць і рэабілітаваныя людзі, асуджаныя за тое, што яны выказвалі сваю думку і нязгоду з тым, што адбываецца, на што яны маюць права ў адпаведнасці з Канстытуцыяй...*

Рэспандэнт_ка 5

*– Ну мне цяжка ўявіць, як можна гэта кампенсаваць. Цяжка. Калі могуць грашыма – добра. Могуць пакаяннем – добра. Не толькі пакаяннем, каб паплакацца адзін раз і ўсё. А сапраўды чалавек каб нешта зрабіў для грамадства...*

Рэспандэнт_ка 1

У колькасным даследаванні, калі рэспандэнты_кі бачылі шэраг варыянтаў таго, якія праявы справядлівасць магла б мець адносна тых, хто перажылі гвалт, спектр выбраных варыянтаў аказаўся значна шырэйшы. Безумоўнымі пазіцыямі-лідарамі, якія былі абраныя больш як 75% рэспандэнтаў_ак, аказаліся кампенсацыя матэрыяльнай і маральнай шкоды, медыцынская і псіхалагічная рэабілітацыя, публічнае аднаўленне добрага імя ахвярам і скіданне рэжыму Лукашэнкі.



Размеркаванне адказаў на пытанне «Калі казаць пра катаванні і/або жорсткае абыходжанне з людзьмі ў Беларусі, якія, на вашую думку, дзеянні варта зрабіць у дачыненні да тых, хто гэта зведаў?»
(можна было абраць некалькі варыянтаў адказу)



Другі блок значных праяваў справядлівасці — перагляд рашэнняў судоў у палітычных справах, прызнанне палітзняволенымі ўсіх, хто гэтага заслугоўвае, і спыненне рэпрэсій з паляпшэннем умоваў утрымання ў месцах зняволення. Гэтыя пазіцыі выбралі больш за палову апытаных.

З астатніх пазіцый варта звярнуць увагу на такую: «Магчымасць вярнуцца дадому (ці заставацца дома) без рэпрэсій, але ў існым рэжыме». Яе як цалкам магчымую адзначылі 28% рэспандэнтаў_ак. То бок, вялікая колькасць апытаных тэарэтычна могуць вярнуцца ў Беларусь, як толькі знізіцца напружанасць рэпрэсій. Нават пры тым, што сам рэжым Аляксандра Лукашэнкі захаваецца.

Калі працягваць аналіз на індывідуальным узроўні і сфакусавацца на праблемах тых, хто перажылі гвалт і змушаны былі пакінуць краіну, то тут ёсць шэраг балючых пытанняў.

Размеркаванне адказаў на пытанне «З якімі цяжкасцямі вы сутыкаліся або сутыкаецеся пасля катаванняў і/або жорсткага абыходжання?» (можна было абраць некалькі варыянтаў адказу)



Па-першае, гэта страх рэпрэсій, у тым ліку асцярогі адносна сваіх родных і блізкіх, якія застаюцца ў Беларусі, — пра гэта кажуць амаль дзве траціны апытаных.

*— Страх. Вельмі моцны страх... Нават калі быў у Акрэсціна і ў СІЗА, я баяўся менш, чым калі выйшаў. Бо калі я апынуўся там, я ўжо разумеў, дзе я і што і што са мной будзе. А калі выйшаў, ужо незразумела. Ты як чакаеш смерці ўвесь час...*

Рэспандэнт_ка 1

*— ...гэта пастаянны страх за сваіх родных, якія працягваюць знаходзіцца ў краіне.*

Рэспандэнт_ка 6

Побач з гэтай пазіцыяй натуральна знаходзіцца «падвышаная ўвага з боку сілавых органаў», актуальная ў любым выпадку, з'ехаў чалавек ці не.

*— ...я звярнуся вось з гэтай заявай, там, у Камітэт па правах чалавека — сястра тэлефануе і плача, і кажа, што «Ты не адпраўляй нічога, бо да нас прыходзяць, нас выклікаюць...»*

Рэспандэнт_ка 8

Другое — псіхалагічныя праблемы, праблемы ментальнага здароўя, якія адзначылі 58% рэспандэнтаў_ак. Да гэтага як вынік дадаецца немагчымасць жыць напоўніцу (максімальна), радавацца жыццю (40%).

*— ...панічныя атакі, яшчэ быў разлад сну. І ўвесь час злосць, трывожнасць.*

Рэспандэнт_ка 1

*— Мае кашмары, якія мяне трывожаць, я не магу іх прыбраць. Наўрад ці нехта там іх можа пачысціць. Мае ўспаміны, флэшбэкі, так бы мовіць, падвісанні нейкія, цяжкі эмацыйны фон, калі я пра гэта кажу.*

Рэспандэнт_ка 6

Асобны блок, характэрны для тых, хто вымушаны быў уцякаць ад пераследу, — гэта адзінота, немагчымасць вярнуцца ў Беларусь, страта сям'і, бацькоў, радзімы. І боль за тое, што адбываецца ў Беларусі:

*— Мае цяжкасці, большай часткай, гэта тое, што я страціла дом. І тое, што ў мяне маці ўхаце засталася адна, ёй шмат гадоў. І гэта ўсе мае цяжкасці, таму што, ну, астатняе як бы я магу забяспечыць.*

Рэспандэнт_ка 3

*— ...самая вялікая цяжкасць — гэта немагчымасць прыехаць да бацькоў... Цяжкасць — тое, што знаёмцы сядзяць у турмах...*

Рэспандэнт_ка 5

Да таго ж ва ўцекачоў дадаецца спецыфічны блок праблем, звязаных з уцёкамі і са зменай краіны існавання: моўныя праблемы — 36%, страта ранейшага статусу (у тым ліку прафесійнага) — 26%, праблемы з легалізацыяй у новай краіне — 25% і г д.

*— Калі мы гаворым пра пераезд, то любы чалавек, пераязджаючы, сутыкаецца прыкладна з аднолькавымі цяжкасцямі, маральны ціск, фінансавыя пытанні, і сацыяльна ўладкавацца... моўныя нейкія пытанні, бар'еры...*

Рэспандэнт_ка 6

*— Цяжкасці — у асноўным, гэта пытанні нейкія або бюракратычныя, або побытавыя. Што можна зрабіць — палегчыць, напэўна, нейкія пытанні легалізацыі для людзей, якія пацярпелі.*

Рэспандэнт_ка 9

Таксама згадваюцца і агульныя праблемы, незалежна ад таго, на якім боку мяжы знаходзіцца чалавек: матэрыяльныя — 36%, медыцынскія — 29%, цяжкасці ў пошуку працы і немагчымасць уладкавацца на нармальную працу — 26% і 18% адпаведна.

У сувязі з гэтым узнікае пытанне: ці патрэбная нейкая дапамога тым, хто перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне? Практычна ўсе апытаныя ў глыбінных інтэрв'ю казалі, што дапамога патрэбная.

Аналіз адказаў на пытанні глыбінных інтэрв'ю (то бок без падказак) выявіў тры асноўныя складнікі такой дапамогі: псіхалагічная падтрымка, медыцынская рэабілітацыя і дапамога ў легалізацыі ў новай краіне.

*— ...напэўна, самае цяжкае, дакладней, наступствы самыя цяжкія — гэта здароўе, прычым не толькі на фізічнае, але і на ментальнае...*

Рэспандэнт_ка 5

*— Калі камусьці трэба, умоўна, там нейкія санаторыі, з'ездзіць падлячыцца, псіхалагічная дапамога, як ні круці.*

Рэспандэнт_ка 1

*— Дапамога ў легалізацыі, напэўна, медыцынская дапамога, і другое, і трэцяе — працягваць, працягваць дакументаваць і збіраць гэтую інфармацыю, доказы злачынстваў.*

Рэспандэнт_ка 10

Дадаткова згадваецца матэрыяльная дапамога, але менавіта ў факультатыўным фармаце. Гэта звязана з тым, што людзі — прынамсі тыя, хто з'ехалі за мяжу — і так атрымліваюць пэўную дапамогу, і прасіць больш ім здаецца недарэчным.

*— Можа быць, грашовая кампенсацыя, хай і невялікая... Ну, вядома ж, ва ўсяго павінны быць свае рамкі, не так, каб чалавек прыехаў і сядзеў на «сацыялцы»...*

Рэспандэнт_ка 1

*— ...пытанні побытавыя ці фінансавыя, мне здаецца, яны не павінны вырашацца за кошт падаткаплатнікаў краіны ці краін, у якіх знаходзіцца пацярпелы чалавек. Гэта можа адбывацца больш нейкімі прыватнымі фондамі.*

Рэспандэнт_ка 9

Варта адзначыць такі прынцыповы момант: шмат хто з апытаных сцвярджае, што менавіта ім дапамога не патрэбна (выкарыстоўваюцца фармулёўкі кшталту «я моцны — я дам рады», «іншым больш трэба», «мне і так ужо дапамагалі дастаткова» і г. д.).

*— Па-мойму, мне няма на што скардзіцца, па-мойму, яны робяць усё, каб я адчуваў сябе на гэтым месцы дастаткова камфортна.*

Рэспандэнт_ка 2

Практычна тое самае было ў 2020 годзе, калі людзі артыкулявалі падобную аргументацыю, адмаўляліся ад дапамогі фондаў салідарнасці ды звярталіся да такіх ініцыятыў толькі ў самых скрайніх выпадках.

Думаецца, гэтая праява глыбейшых прычын, чым, напрыклад, упэўненасць у асабістых сілах або ўстаноўка на непрыманне дапамогі звонку. Рэч у тым, што ў нас, у беларусаў, няма досведу лабіявання сваіх інтарэсаў, адвакацыі ці хаця б абароны сваіх правоў, асабліва на групавым узроўні. За апошняе дзесяцігоддзе мы крыху навучыліся адстойваць свае правы на персанальным узроўні і яшчэ мікраўзроўні, то бок абараняць сваю мікраячэйку — сям'ю, сяброў, калектыў. А вось тое, што хоць крыху вышэй, больш і шырэй — не ведаем, не ўмеем і не разумеем, навошта гэта трэба. Да апошняга выжываем у адзіноце: «я моцны, мне дапамога не патрэбная», а потым — перагарэў, знямог і брык на бок.

Звесткі колькаснага даследавання кажуць, што магчымасцю атрымаць той ці іншы від дапамогі скарысталіся крыху менш за 2/3 апытаных — 64%. Адзначылі, што па дапамогу не звярталіся, бо з усім далі рады самастойна, 26% рэспандэнтаў_ак. І яшчэ 10% адзначылі, што ім не хапае інфармацыі аб тым, куды і па якую дапамогу можна звяртацца. Калі казаць больш дэталёва, то тую ці іншую дапамогу атрымалі: матэрыяльную — 39% апытаных, юрыдычную — 33%, псіхалагічную — 31%, меды-

цынскую — 25%. Дапамогу ў вырашэнні арганізацыйных пытанняў атрымалі 12% рэспандэнтаў_ак.

Размеркаванне адказаў на пытанне «Якога тыпу дапамога вам была патрэбная?»
(можна было абраць некалькі варыянтаў адказу)




Калі казаць пра тое, што яшчэ можа быць зроблена, у прыватнасці, уладамі тых краін, дзе цяпер знаходзяцца людзі, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне (акрамя Беларусі), то ў глыбінных інтэрв'ю гэтае пытанне выклікала пэўныя цяжкасці. Як аказалася, беларусам і беларускам складана разважаць аб дапамозе ў свой бок. Таму асноўныя пажаданні былі фактычна два:

мясцовым уладам:

*— Яны маглі б дапамагчы адаптавацца на новым месцы... калі мы не можам цяпер вярнуцца... яны маглі б дапамагчы як мінімум сябе адчуваць тут жывейшымі...*

Рэспандэнт_ка 6

міжнародным арганізацыям і праваабаронцам:

*— Не магу нічога раіць міжнароднай супольнасці і праваабаронцам, але я б... больш накіравана працавала б з палітзняволенымі, якіх вельмі шмат...*

Рэспандэнт_ка 3

У колькасным даследаванні, дзе трэба было не разважаць самастойна, а выбіраць з шэрагу варыянтаў, рэспандэнтам_кам было нашмат лягчэй адказваць. Як відаць з табліцы, асноўныя пазіцыі тут у цэлым супадаюць з тым, што гаварылі рэспандэнты_кі ў глыбінных інтэрв'ю: па-першае, неабходна палегчыць працэс легалізацыі (64%) і адаптацыі ў новай краіне (56%); па-другое, праца для прыцягнення рэжыму да адказнасці (60%) і дакументавання злачынстваў рэжыму (52%). У дадатак да гэтага важную ролю маюць магчымасці медыцынскай рэабілітацыі (37%), матэрыяльная падтрымка (35%), псіхалагічная дапамога (26%).

Размеркаванне адказаў на пытанне «Што, на вашую думку, маглі б зрабіць улады краіны, дзе вы цяпер знаходзіцеся, каб дапамагчы пацярпелым ад катаванняў і/або жорсткага абыходжання дасягнуць правасуддзя або палегчыць іх становішча?»
(можна было абраць некалькі варыянтаў адказу)




Асобным блокам у даследаваннях ішлі пытанні, якія тычыліся груп або супольнасцяў, што аб’ядноўвалі бы беларусаў_ак, якія перажылі катаванні і/або жорсткае абыходжанне. Аказалася, што на гіпатэтычным узроўні рэспандэнты_кі гатовыя разважаць аб неабходнасці і карысці такіх аб’яднанняў і супольнасцяў.

*— (такія супольнасці) Маглі б падтрымаць нейкімі кантактамі, нейкімі сувязямі, нейкімі працаўладкаваннямі, нейкімі лайфхакамі ў новым месцы, у новай краіне.*

Рэспандэнт_ка 6

*— Вядома, было б важна, каб людзі збіраліся, каб людзі ведалі адно пра аднаго, каб гэтыя арганізацыі займалі, інфармацыйна і сваімі справамі, займалі пэўныя нішы і дамагаліся выніку...*

Рэспандэнт_ка 4

У лікавым вымярэнні гэта выглядае наступным чынам: той ці іншы ўдзел у супольнасцях такога кірунку (і, калі меркаваць па адказах на адкрытыя пытанні, шырэйшага, агульнадыяспаральнага тыпу) бярэ толькі 27% апытаных (нешта робяць рэгулярна — 9%, раз-пораз — 11%, рэдка — 7%).

А адносна таго, наколькі былі б карысныя такія супольнасці, то іх гіпатэтычную каштоўнасць канкрэтна для сябе адзначылі толькі 23%. Яшчэ 32% выказаліся за тое, што агулам гэта карысна, хоць і не для іх асабіста, а 23% рэспандэнтаў_ак выбралі варыянт адказу «Цяжка сказаць».

*— Я асабіста ў такіх групах не маю патрэбы, таму гэтая тэма мяне не цікавіць, ну асабіста мяне.*

Рэспандэнт_ка 2

*— Ну для мяне асабіста напэўна няма такой вострай неабходнасці.*

Рэспандэнт_ка 1

У завяршэнне — некалькі важных момантаў.

Асобная тэма для беларусаў_ак — стаўленне да гвалту наогул. Даследаванне 2019 года паказала[44], што ў беларусаў_ак агулам высокі ўзровень талерантнасці да дзяржаўнага гвалту. Гэтая тэза справядлівая і ў рамках ацэнкі гвалту ў дачыненні да сябе. Асабліва пасля 2020 года, калі гвалт стаў звычайным, рутынізаваўся. Сітуацыю пагаршае параўнанне сваёй сітуацыі з гіпатэтычнымі іншымі, перш за ўсё са становішчам тых людзей, якія цяпер знаходзяцца ў месцах зняволення. Працуе логіка, дзе, груба кажучы, «Сінякі загаіліся, ну і добра...».

44 «Измерение уровня толерантности белорусов к государственному насилию». Отчет по результатам исследования. https://survey.protivpytok.org/

*— У прынцыпе, усё, што я перажыў, я тое ўжо, можна сказаць, выправіў сам. Ужо.*

Рэспандэнт_ка 1

*— ...я не атрымаў нейкіх непапраўных праблем са здароўем... мяне збівалі, але гэта прайшло.*

Рэспандэнт_ка 9

У выніку ў катаваннях і/або жорсткіх умовах утрымання людзі часта не бачаць нічога надзвычайнага. Атрымліваецца, што гвалт — ён хутчэй другасны; часта першае месца займае іншае злачынства, зноў жа гістарычнага плану — захоп і ўтрыманне ўлады, фальсіфікацыя вынікаў выбараў і выцясненне людзей з радзімы (сустракаюцца меркаванні, што гвалт — глупства, значна больш баліць, што са сваёй зямлі прагналі).

*— Нічога страшнага няма, жыццё працягваецца, але адрэзалі ад маёй зямлі...*

Рэспандэнт_ка 6

*— Таксама шмат знаёмцаў, хто былі неяк пакараныя, збітыя, іншыя сітуацыі. Ну і ў цэлым успрыманне гэтай рэальнасці сённяшняй, адчуванне, у якім стане знаходзіцца Беларусь. У якім стане знаходзяцца людзі, якія застаюцца тамака? Мне здаецца, што гэта такія самыя... ну для мяне самыя цяжкія рэчы цяпер.*

Рэспандэнт_ка 5

Яшчэ адзін важны момант: у сваіх развагах аб справядлівасці людзі рэдка кіруюцца прынцыпам таліёна («вока за вока», адплата).

*— ... умоўна кажучы, у дзень, калі ты 30 чалавек садзіш на 15 содняў кожнага, вось гэтыя ўсе содні ты таксама павінен адседзець... Каб кожныя содні, якія ён даў несправядліва нейкаму чалавеку, каб ён сам іх таксама адседзеў за кожнага.*

Рэспандэнт_ка 12

З большага людзі ўсё ж кіруюцца іншым: яны патрабуюць аднаўлення законнасці і пакарання вінаватых у гвалце ў судовым парадку («хай вырашае суд», «пацярпелыя не могуць судзіць» і г. д.).

*— Усё павінна быць паводле закона. Ёсць закон, і паводле яго павінны гэтых людзей судзіць. І гэта не могуць вырашаць тыя, каго катавалі... калі гэта будзе, то пры новай уладзе, я спадзяюся, што гэта будзе вырашаць закон, суд.*

Рэспандэнт_ка 3

Наогул жа лейтматыў, напэўна, такі: задача-мінімум — спыненне рэпрэсій, а задача-максімум — скіданне рэжыму і вяртанне на радзіму.

*— ...не ўяўляецца мне, што зможа неяк мяне ў гэтым сэнсе супакоіць. Але вось калі гэтая сітуацыя вырашыцца, калі людзей перастануць так затрымліваць, катаваць, рэпрэсаваць, вось тады, напэўна, я ўздыхну з палёгкай... з майго пункту гледжання, справядліва будзе, калі рэжым упадзе.*

Рэспандэнт_ка 7

# Пасляслоўе

Гісторыя паказвае, што паспяховыя пераходы да дэмакратыі грунтуюцца на ўцягванні ўсіх слаёў грамадства, асабліва найбольш пацярпелых ад папярэдняга рэжыму. Пацярпелыя ад рэпрэсій павінны мець магчымасць не толькі быць пачутымі, але і актыўна ўдзельнічаць у фармаванні новага дэмакратычнага парадку. Досвед людзей, якія перажылі пакуты, дае ўнікальнае разуменне таго, якія змены неабходныя для аднаўлення справядлівасці. Ігнараванне ж іх галасоў можа прывесці да новых формаў несправядлівасці і ўзнаўлення праблем, ідэнтычных тым, супраць якіх мы змагаемся сёння.

Міжнародныя стандарты гавораць, што працэсы правасуддзя пераходнага перыяду павінны быць арыентаваныя на інтарэсы пацярпелых, прызнаючы іх цэнтральную ролю і асаблівы статус у распрацоўцы і ажыццяўленні гэтых працэсаў. Апроч простага ўліку меркавання, навукоўцы-эксперты міжнароднага права кажуць, што пацярпелыя не павінны разглядацца толькі як пасіўныя атрымальнікі_цы правасуддзя. Эфектыўнае правасуддзе пераходнага перыяду павінна быць пабудаванае на ўліку патрэбаў кожнага_ай канкрэтнага_ай пацярпелага_ай, што забяспечыць іх актыўны ўдзел у працэсе пераходу ад дыктатуры да дэмакратыі і дапаможа аднавіць іх давер да прававой сістэмы. Інакш існуе рызыка страты індывідуальнага падыходу ў працэсах аднаўлення правоў.

Мы перакананыя, што шляхам шырокага грамадскага дыялогу, павагі розных думак усіх пацярпелых можна пабудаваць дэмакратычнае грамадства, якое будзе абараняць правы кожнага_ай грамадзяніна_кі і прадухіляць паўтарэнне мінулых памылак.

# Дадатак

## Атрыбутаванне рэспандэнтаў і рэспандэнтак глыбінных інтэрв’ю

Рэспандэнт_ка 1 — мужчына, 21–30 гадоў, адукацыя сярэдняя спецыяльная, 2020.

Рэспандэнт_ка 2 — мужчына, 41–50 гадоў, адукацыя няскончаная вышэйшая, 2022.

Рэспандэнт_ка 3 — жанчына 31–40 гадоў, адукацыя няскончаная вышэйшая, 2020.

Рэспандэнт_ка 4 — мужчына, 60+ гадоў, адукацыя вышэйшая, 2023.

Рэспандэнт_ка 5 — мужчына, 31–40 гадоў, адукацыя вышэйшая, 2020.

Рэспандэнт_ка 6 — мужчына, 31–40 гадоў, адукацыя вышэйшая, 2021.

Респондент_ка 7 — мужчына, 21–30 гадоў, адукацыя невядомая, 2022.

Рэспандэнт_ка 8 — жанчына, 51–60 гадоў, адукацыя вышэйшая, 2023.

Рэспандэнт_ка 9 — мужчына, 21–30 гадоў, адукацыя сярэдняя, 2022.

Рэспандэнт_ка 10 — мужчына, 31–40 гадоў, адукацыя вышэйшая, 2023.

Рэспандэнт_ка 11 — жанчына, 51–60 гадоў, адукацыя невядомая, 2021.

Рэспандэнт_ка 12 — мужчына, 31–40 гадоў, адукацыя вышэйшая, 2023.



2024